# ФИЛОСОФИЯ

УДК 165.6/8

## ЗУЛЬЦЭР З «КРЫТЫЧНАЙ ПАЗІЦЫІ» КАНТА

*канд. філас. навук, дац. Р.Д. ГРУДНІЦКІ (Полацкі дзяржаўны універсітеэт)*

*Зроблен аналіз творчасці нямецкага асветніка, прыхільніка «папулярнай філасофіі» Ёгана Зульцэра з пункту гледжання перадумоў і механізма фарміравання ідэі актыўнасці суб'екта пазнанняў філасофскай дактрыне Канта.*

Нямецкі філосаф-асветнік Зульцэр належаў да той інтэлектуальнай плыні, якая ў Германіі XVIII ст. атрымала назву «папулярнай філасофіі». Эмпірычна зарыентаваная «папулярная філасофія» нідзе і ніколі не парывала канчаткова з рацыяналістычным агульнаасветніцкім ідэалам чалавека, пакланялася яго «разумнасці», але адначасова, і галоўным чынам, падкрэслівала яго прыродна-сацыяльную існасць. Абстрактна-рацыяналістычны ідэал чалавека тут напаўняецца пазітыўным зместам яго пачуццёвага жыцця. Галоўным аб'ектам эмпірычнага даследавання становіцца пачуццёва-эмацыянальная сфера, якой у рацыяналістычнай мадэлі суб'екта адводзілася роля прамежкавай і другаснай здольнасці. Падвойны падзел пазнавальных здольнасцей на тэарэтычную (розум) і практычную (воля), прыняты ў рацыяналізме, тут дапаўняецца пачуццёвасцю. Пры гэтым пачуццёвасць разглядаецца не проста як трэцяя, але і роўнаўзроўневая здольнасць суб'екта побач з розумам і воляй.

Гэта вызначыла і пераарыентацыю тэарэтычных даследаванняў. Уласцівыя рацыяналізму метафізічна-гнасеалагічныя пабудовы выцясняюцца аналізам маральна-эстэтычнай дзейнасці чалавека. Шчасце як канкрэтнае перажыванне пачуцця ўнутранай гармоніі паўстае вышэйшым прызваннем чалавека. Само ж уяўленне аб прыродзе чалавека падвяргаецца тут своеасаблівай сентыменталізацыі, што выявілася ў ідэалізацыі патрыярхальнай прастаты нораваў [1, с. 215]. Маральныя асновы асобы чалавека пераносяцца ў сферу пачуццёвасці. Аб'ектам даследавання становіцца не абстрактная «воля» рацыяналізма, а дабрадзейныя ўчынкі і маральныя заслугі, што непасрэдна праяўляюцца ў паўсядзённым жыцці чалавека. На першы план вылучаецца сфера пачуццяў, адчуванняў як асновы маральнага жыцця.

Можна сказаць, што ў «папулярнай філасофіі» пачуццёвае жыццё чалавека падвяргаецца своеасаблівай рэабілітацыі. Традыцыйная ж тэарэтычная праблематыка філасофіі звялася тут да псіхалагічнага аналіза здольнасцей, якія ўдзельнічаюць у працэсе пазнання. Гэтая псіхалагізацыя прыроды суб'екта пазнання найбольш яскрава выявілася ў эстэтычных даследаваннях «папулярных філосафаў». Варта адзначыць, што разважанні над сутнасцю мастацтва былі ці не самай характэрнай асаблівасцю «папулярнай філасофіі». Пры гэтым эстэтычныя каштоўнасці разглядаюцца тут як найвышэйшае ажыццяўленне адзінства духа і пачуцця. Гэтае адзінства знаходзіць сваё ўвасабленне менавіта ў эмацыянальнай сферы і дзякуючы ёй. Больш за тое, увесь псіхалагічны аналіз пачуццяў у «папулярнай філасофіі» падпарадкаваны менавіта абгрунтаванню гэтых эстэтычных каштоўнасцей. Існасць чалавека тут у значнай ступені эстэтызаваная. Пры гэтым эстэтычная канцэпцыя эмпірызма з самага пачатку скіравана супраць рацыяналістычнага разумення прыгажосці як лагічнай дасканаласці. Падставай прыгажосці з'яўляюцца не фармальна-лагічныя правілы, а творча-актыўная дзейнасць непаўторнай асобы, якая разбурае правілы ў творчым акце. Гэтая эстэтычная арыентацыя «папулярнай філасофіі» садзейнічала станаўленню новай тэорыі мастацтваў, але як папярэдняя ўмова вырашэння гэтай задачы яна вымагала аналіза прыроды суб'екта пазнання.

Эстэтызацыя гнасеалагічнай праблематыкі ў творчасці «папулярных філосафаў» - з'ява не выпадковая. Разважанні над прыродай мастацкай творчасці ўпершыню адкрываюць актыўную сама-дзейнасць суб'екта, які творыць аб'ект эстэтычнага ўспрымання. Мастацкая каштоўнасць гэтага аб'екта абумоўлена не яго прыроднымі якасцямі, а пераўтваральнай дзейнасцю чалавека, што напаўняе прадмет сацыяльна значным зместам. Адкрытае ў эстэтычных каштоўнасцях адзінства духоўнага і пачуццёвага жыцця чалавека становіцца вызначальным у разуменні не толькі суб'екта як суб'екта эстэтычнай альбо маральнай, але і гнасеалагічнай дзейнасці.

З другога боку, адзінства пачуццёвага і рацыянальнага, увасобленае ў мастацкім вобразе як выніку творча-эстэтычнай дзейнасці, ажыццяўляецца ў сферы эмацыянальнага жыцця чалавека. Гарантам гэтага адзінства, сродкам, які ўпершыню забяспечвае сувязь духа і пачуцця, з'яўляецца адчуванне. І пры гэтым разам з эстэтызацыяй адчування ажыццяўляецца і яго канчатковая суб'ектывізацыя. Адчуванне выклікана ўздзеяннем прадмета на здольнасць адчування, але з'яўляецца не сведчаннем наяўнасці прадмета

па-за суб'ектам, а толькі пэўным станам душы. Таму адчуванне, а значыць - і душа, нічога агульнага з прадметам не маюць.

Аналіз пачуццёвага боку чалавечай прыроды, здзейснены Зульцэрам, прыводзіць да высновы аб поўнай аўтаноміі эмацыянальнага жыцця душы. Усе разнастайныя праявы суб'ектыўнай актыўнасці чалавечага духа былі зведзены да дзвюх здольнасцей, «якія з'яўляюцца крыніцай усіх іншых змяненняў і азначэнняў душы» [2, с. 213]. Такімі здольнасцямі з'яўляюцца здольнасць уяўлення чаго-небудзь і здольнасць адчування. Першая выступае сродкам пазнання ўласцівасцей прадмета, другая - пазнаннем прыемных альбо непрыемных хваляванняў. Ні ў адным, ні ў другім выпадку суб'ект не мае аніякага дачынення да прадметаў. Сапраўды, здольнасць уяўлення - гэта пазнанне прадмета, «якога душа ўяўляе сабе без непасрэднай дапамогі пачуццяў». А адчуванне, як і ўсякае прыемнае ці непрыемнае ўражанне, з'яўляецца выключна актам душы, які нічога агульнага з прадметам не мае. Зульцэр нідзе не дае выразнага і дакладнага азначэння ўяўлення. Аднак тэксталагічны аналіз дазваляе зрабіць выснову, што гэта здольнасць душы ствараць вобразы на падставе раней атрыманых пачуццёвых уражанняў. Паколькі ж гэтыя ўражанні, як пэўныя сляды папярэдніх успрыманняў, непасрэдна з прадметамі не звязаныя, то душа ў стане ўяўлення здольна звязваць разнастайныя ўражанні ў адзіны вобраз адвольным спосабам. Сукупнасць створаньгх вобразаў успрымаецца душой у стане ўяўлення як пэўная цэласнасць, у якой аніводзін вобраз не ўспрымаецца як штосьці асобнае. Для такога выдзялення неабходна дадатковае намаганне, напружанасць душэўных сіл. Выдзелены такім намаганнем прадмет набывае выразнасць і становіцца адзінкавым прадметам уяўлення. Але адначасова гэта вядзе да страты ўяўлення цэласнасці. Выразнасць прадмета ўяўлення гарантаваная толькі тады, калі гэты прадмет ёсць штосьці простае. Калі ж прадмет складаны, то дзейнасць здольнасці ўяўлення скіравана на раздзяленне яго і выдзяленне яго складовых частак, якія далей ужо дзяліць немагчыма. Гэтая аналітычная дзейнасць суб'екта ажыццяўляецца такім чынам, што ў кожны дадзены момант выразным з'яўляецца толькі адно ўяўленне адной часткі прадмета. Усе іншыя часткі яго і ўсе іншыя прадметы нібы зацямняюцца і ўтвараюць цьмяныя ўяўленні, непасрэдна звязаныя з выразным. Гэта значыць, што ў цьмяныя ўяўленні ўключаны не любыя элементы вобраза, не любыя вобразы, а толькі роднасныя таму, якое ўспрымаецца выразна. Дзякуючы гэтаму розум набывае здольнасць пераходзіць ад аднаго вобраза да другога, ад адной ідэі да другой. Яго аналітычная дзейнасць спалучаецца з асацыіруючай дзейнасцю па прынцыпу падабенства.

Сувязь вышэйпрыведзеных разважанняў з англійскім эмпірызмам відавочная. Але ў гэтым факце выяўляецца і сувязь з лейбніца-вольфаўскай метафізічнай традыцыяй, у прыватнасці, з лейбніцавай ідэяй «цьмяных уяўленняў». Гэта яшчэ адно пацвярджэнне таго, што нават у найбольш паслядоўным эмпірызме нямецкай Асветы сувязь з рацыяналістычнай традыцыяй канчаткова не пераадолена. Але найбольш паказальным з'яўляецца той факт, што ўплыў рацыяналізма аказваецца большым за ўсё тады, калі ўласна эмпірычныя пабудовы выяўляюць схільнасць да крайняга суб'ектывізма і рэлятывізма.

Такім чынам, творчая прырода суб'екта пазнання праяўляецца ў дзейнасці душы, якая валодае здольнасцю ўялення. Але паколькі ўяўляючы суб'ект усю сваю ўвагу засяроджвае на аб'екце, то ўсе астатнія яго здольнасці як быццам прытупляюцца. Уяўляючы суб'ект не зведвае ні жаданняў, ні адчуванняў. Уяўленне адначасова ёсць і поўнае забыццё суб'ектам самога сябе. Менавіта таму ў стане ўяўлення суб'ект не заўважае сваёй актыўна-канструктыўнай здольнасці. Простыя паняцці прадметаў, якія з'яўляюцца вынікам аналітычнай дзейнасці ўяўляючага суб'екта, усведамляюцца ім ужо па завяршэнні і ўспрымаюцца як штосьці дадзенае. Уяўляючы суб'ект паўстае як абстрактная істота, ніяк не звязаная са светам. Усё тое, што не мае дачынення да яго разважанняў, выконваецца ім механічна і неўсвядомлена. Гэты стан суб'екта называецца «станам разважання» і з'яўляецца сродкам пазнання. Пазнанне, такім чынам, зводзіцца да аналіза пачуццёвых уражанняў і іх асацыяцыям. Паколькі ва ўяўленні суб'ект нічым знешнім не абумоўлены, то пазнанне, па сутнасці, носіць спантанны характар. З гэтага пункту гледжання ўяўленне ёсць не што іншае, як спантанная здольнасць тварыць вобразы, здольнасць, у аснове якой ляжыць гульня фантазіі. Дзякуючы гэтаму суб'ект набывае здольнасць ствараць свой прадмет у адпаведнасці са сваімі здольнасцямі. Гэта гарантуе яму аўтаномію адносна чужых прыродных сіл. Разам з тым гэта азначае, што пазнанне заснавана на інтуіцыі, зразумелай як інтэлектуальнае сузіранне, у падмурку якога ляжаць ідэі ўнутранага і знешняга досведу.

Другі стан душы, заснаваны на адчувальнай здольнасці, гэта «стан адчування». Вышэй ужо адзначана, што адчуванне ўзнікае як вынік уздзеяння на «адчувальную здольнасць» знешніх прадметаў. Аднак гэта не азначае, што ў адчуванні нам дадзены прадмет. На думку Зульцэра, «адчуваюць не прадмет, а самога сябе». У стане адчування суб'ект заняты толькі сабой. Без гэтай умовы адчуванне проста немагчымае. Пра гэта сведчыць хаця б той факт, што ў стане разважання нават самыя моцныя ўражанні застаюцца непрыкметнымі. Паколькі ўсе сілы душы скіраваны на прадмет, то адчуванне ёю самой сябе губляецца. Значыць, каб адчуванне дасягнула бачнасці душы, апошняя павінна адцягнуць увагу ад прадмета і засяродзіцца на ўласным стане. Пры гэтым адчуванне будзе тым больш моцным, чым больш цьмяным будзе пачуццёвае ўражанне. «Можна сказаць, - піша Зульцэр, - што моц адчування

заўжды прапарцыянальна ступені цьмянасці, якая пануе сярод уяўленняў. Гэта значыць, што чым болын цьмянае ўяўленне, тым больш моцнае адчуванне яно вызывае» [2, с. 248].

Неабходна зазначыць, што ў гэтым праяўляецца галоўнае адрозненне нямецкага асветніцкага эмпірызма ад эмпірызма XVII ст. Там адчуванне не толькі вызываеца прадметам, але і нясе ў сабе некаторыя элементы зместу прадмета. Яно таму ёсць не толькі станам душы, але і сродкам сувязі яе з прадметам, са знешнім светам. У «папулярнай філасофіі» адчуванне губляе анталагічны статус вобраза рэальнага прадмета. Яно канчаткова зводзіцца толькі да пэўных мадыфікацый душы. Яго каштоўнасць заключаецца не ў тым, што яно нясе інфармацыю аб прадмеце, а ў тым, што яно ўпершыню фарміруе ўражанне са станоўчай альбо адмоўнай эмацыянальнай афарбоўкай. Каштоўнасць адчування - не ў яго сувязі з прадметам, а менавіта ў гэтай эмацыянальнай афарбоўцы. Дзейнасць душы ў стане адчування заключаецца ў тым, што яна вызваляецца ад уяўленняў, якія яе занадта ўзбуджаюць і гэтым вызываюць непрыемныя ўражанні. Але паколькі ўсё гэта адбываецца ў замкнутай сферы суб'ектыўнасці, то душа шляхам перамены ўласных намаганняў і прымянення сваіх здольнасцей упершыню фарміруе той альбо іншы стан. Пры гэтым яе дзейнасць скіравана на дасягненне ўраўнаважанага стану, калі ўсе сілы душы прыведзены ў дзеянне, але аніводная з іх не напружваецца. «Здольнасць уяўлення» лёгка і свабодна дапасоўваецца да «здольнасці адчування». Душа то засяроджваецца на прадмеце ўяўлення, то «адпускае» яго, каб засяродзіцца на тых адчуваннях, якія гэты прадмет у ёй выклікае. Душа не імкнецца ні да выразных уяўленняў, ні да выразнасці адчуванняў. Тут няма ні пазнання, ні моцнага перажывання. Разумны дух цесна зліваецца з пачуццёвай сферай і стварае ўяўленне адзінства і гармоніі, цэльнасці чалавечага ўнутранага жыцця ва ўсёй паўнаце яго праяў. Суб'ект свабодна злучае і раздзяляе разнастайныя вобразы і фарміруе свой уласны свет, у якім і выяўляе здзейсненае адзінства ўсіх сваіх здольнасцей. Суб'ект «зачараваны» багаццем і свабодай свайго ўнутранага жыцця, незалежнага ад сляпых сіл пазачалавечай прыроды. Гэтая здольнасць ёсць падставай эстэтычнай дзейнасці і адначасова - найбольш поўным праяўленнем сутнасных сіл чалавека. Гэты стан у Зульцэра называецца «станам сузірання».

Стан сузірання падпарадкаваны спецыфічнай здольнасці душы - «здольнасці адабрэння». Яна прынцыпова адрозніваецца як ад пазнавальнай здольнасці, альбо розуму, так і ад здольнасці «хацення», ці волі. Гэта той сродак, які забяспечвае поўную незалежнасць пачуццёва-эмацыянальнага жыцця чалавека. Гэта вядзе да высновы аб тым, што «існуе стан, у якім чалавек выразна бачыць, але не адчувае; стан, калі ён адчувае, але не бачыць нічога; і трэці - калі ён і бачыць і адчувае дастаткова выразна, каб заўважыць тое, што ёсць у ім і па-за ім» [2, с. 248].

Зульцэр следам за сваімі англійскімі інспіратарамі запачаткаваў тое сумненне, якому ў недалёкім буучым будзе падвергнута метафізічная ідэя ўнутранай інтэлігібельнасці быцця, што і робіць яго дасягальным для пазнання. Свет, як ён дадзены суб'екту, з пункту гледжання эмпірызма ўяўляе сабой адзінкавую канкрэтнасць. Гэтая канкрэтнасць, па-першае, лавіцца толькі з дапамогай пачуццяў, па-другое, не паддаецца паняційнай апрацоўцы і, па-трэцяе, можа быць інтэрпрэтавана не з пункту гледжання ісціны, а толькі адносна яе прыемнасці альбо непрыемнасці, карыснасці альбо шкоднасці для суб'екта. Тое ж пазнанне ўласцівасцей прадмета, пра якое вядзе гаворку Зульцэр, на самой справе азначае адно: выяўленне функцыянальных залежнасцей паміж узбуджэннямі суб'екта, якія ён атрымлівае ад знешніх прадметаў, і яго паводзінамі. Сам жа прадмет як аб'ект пазнання аказваецца няўлоўным для суб'екта. Ды ён і непатрэбны суб'екту, бо асноўная мэта яго - не пазнанне прадмета, а дасягненне шчасця, заснаванага на гармоніі ўнутраных здольнасцей душы.

Пазнанне тут зводзіцца да выяўлення ў навакольным свеце карысных для суб'екта прадметаў. Толькі такія прадметы здольныя сфарміраваць у суб'екта ўяўленне прыгажосці і гэтым падштурхоўваць яго да дзеянняў, скіраваных на дасягненне гэтай прыгажосці і ўстараненне бескарыснага і пачварнага. Пазнанне па сутнасці выконвае тут падпарадкаваную, другасную ролю. Яно забяспечвае арыентацыйна-прыстасавальніцкую дзейнасць арганізма.

Можна сцвярджаць, што з Зульцэра ў «папулярнай філасофіі» узнікаюць і развіваюцца сама меней дзве асноўныя тэндэнцыі. Па-першае, гэта імкненне да канчатковага падзелу і поўнай аўтанамізацыі розных здольнасцей суб'екта, а значыць, і сфер яго дзейнасці. Па-другое ж, гэта тэндэнцыя да эстэтызацыі, а часта нават і біялагізацыі працэса пазнання. На гэтай аснове мімаволі ажыццяўляецца разбурэнне самой гнасеалагічнай праблематыкі ў дакладным філасофскім сэнсе гэтага слова.

Выдзяліўшы адчуванні ў якасці першапачатковай эстэтычнай здольнасці, Зульцэр спрабуе выявіць адрозненні паміж ёю і здольнасцю пазнання і маральнай дзейнасці. Пры гэтым у яго творчасці выразна праяўляецца характэрная для ўсёй асветніцкай культуры маралізацыя эстэтычнага. Ідэя прыгажосці ў Зульцэра застаецца падпарадкаванай ідэі дабра. Але характар сувязей маральнага і эстэтычнага і адметнасць гэтых здольнасцей аўтарам не даследаваны.

Аналіз жа ўласна гнасеалагічнай праблематыкі прыводзіць да высновы аб тым, што аб'ект пазнання ўпершыню фарміруецца актыўна дзейным суб'ектам у форме пачуццёвага вобраза. Праўдзівасць гэтых вобразаў тлумачыцца не іх сувяззю з рэальна існуючымі прадметамі, а той узгод-

ненасцю, якая мае месца паміж элементамі, што складаюць вобраз (адчуванні, уяўленні), з аднаго боку, і да якой у працэсе фарміравання пачуццёвага вобраза прыходзяць розныя пазнавальныя здольнасці, з другога. Чым вышэйшая ступень узгодненасці, тым вышэйшы ўзровень верагоднасці вобраза і яго падабенства з правобразам.

Такая трактоўка ісціны вядзе да вельмі істотных цяжкасцей. Па-першае, узгодненасць здольнасцей, гэтак жа, як і ўзгодненасць элементаў, з якіх фарміруецца вобраз, ёсць вынікам чыста суб'ектыўнай і таму адвольнай фантазіі. Таму адзначаная ўзгодненасць можа сведчыць не аб сапраўднасці вобраза, а толькі аб ураўнаважанасці псіхічных станаў суб'екта. Па-другое, паколькі і адчуванні, і ўяўленні як структурныя элементы вобраза нічога агульнага з рэальнымі прадметамі не маюць, то няма ніякай магчымасці ад узгодненасці вобразаў і суб'ектыўных здольнасцей перайсці да іх сувязей з прадметамі рэальнага свету. Гэта не толькі выключае магчымасць аб'ектыўнага крытэрыя ісціны, але і нараджае небяспечнасць і непазбежнасць перахода на пазіцыі саліпсізма. Пазнавальная ж актыўнасць суб'екта, адарванага ад знешняга свету, ператвараецца тут у псіхабіялагічную дзейнасць, на падставе якой разгортваецца маральная практыка і мастацкая творчасць.

Эмпірычная трактоўка суб'екта пазнання вядзе да таго, што чыста суб'ектыўнае жыццё надзвычай прамалінейна атаясамліваецца з аб'ектыўна-рэальным светам. У выніку эмпірычны досвед напаўняецца ілюзорным зместам, з якога элімінуюцца ўсе прыкметы рэальнасці. Сутнасць жа суб'екта зводзіцца да гарманічнага псіхафізічнага адзінства розных «здольнасцей душы», у якім розум узгадняецца з пачуццёвасцю, і гэтая ўзгодненасць забяспечваецца адчуваннем. Самое ж цэласнае поле жыццядзейнасці чалавека, умовай ажыццяўлення якой з'яўляецца спантанная актыўнасць суб'екта, распадаецца на тры самастойныя сферы: сферу мастацтва, дзе суб'ектыўная актыўнасць праяўляецца як здольнасць паэтычнай творчасці; сферу тэорыі, дзе яна выступае ў якасці «сілы мыслення», якая канстытуіруе агульныя паняцці; сферу маральнасці, у якой актыўнасць праяўляецца як «самадзейнасць душы», што дазваляе свабодна выбіраць напрамак дзейнасці і абгрунтоўваць аб'ектыўнасць гэтага выбару. «Сіла мыслення» тут толькі дэкларуецца, бо пытанне аб яе канструктыўных здольнасцях, а тым больш - аб крыніцах паходжання і ўмовах ісціннасці агульных паняццяў, якія выступаюць вынікам дзейнасці гэтай сілы, тут не знаходзіць адказу. Аналіз жа гэтых трох сфер, здзейснены эмпірызмам, вядзе філасофскія даследаванні да наступных высноў:

1) адзінай крыніцай пазнання з'яўляецца досвед як сфера суб'ектыўных адчуванняў;
2) прырода рэальных прадметаў абумоўлена іх пачуццёвай дадзенасцю і даступная для пазнання ў алагічнай сферы перажыванняў і не падлягае паняційнай апрацоўцы;
3) паколькі адзіным спосабам адносін навукі да рэчаіснасці з'яўляюцца пазапазнавальныя адносіны ў сферы пачуццёвага жыцця, то навуковае пазнанне ў дакладным сэнсе гэтага слова немагчымае.

Эмпірызм асветнікаў разбурыў метафізічную ідэю інтэлігібельнасці свету, але псіхалагізаваўшы мысленне, ён не толькі ліквідаваў яго спецыфіку, а яшчэ і выявіў сваю нездольнасць абгрунтаваць самадзейнасць у аб'ектыўных межах культуры. Гэты разумовы крызіс, у якім аказалася нямецкая асветніцкая філасофія, стаўся той тэарэтычнай асновай, на якой развівалася філасофія Канта.

## ЛІТАРАТУРА

1. Жирмунский В.М. Очерки по истории классической немецкой литературы. - Л.: Худ. лит., 1972. - С. 215, 288.
2. Sulzers vermischte philosophische Schriften. – Berlin, 1800. – S. 213.